УДК 94(4)+327.8(4)

# "ХРОНІКА ПОЛЬСКАЯ, ЛІТОЎСКАЯ, ЖАМОЙЦКАЯ І ЎСЁЙ РУСІ" МАЦЕЯ СТРЫЙКОЎСКАГА ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў СЯРЭДЗІНЕ XV – СЯРЭДЗІНЕ XVI СТ.

***Людміла Мікалаева***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, Мінск, Беларусь*

У артыкуле аналізуецца змест "Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсёй Русі" Мацея Стрыйкоўскага. Робіцца выснова аб магчымасці выкарыстання яе ў якасці цікавай самастойнай крыніцы па гісторыі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў сярэдзіне XV – пачатку XVI ст

***Ключавыя словы: крыніцы, знешняя палітыка, Вялікае Княства Літоўскае, Мацей Стрыйкоўскі***

Дадзены артыкул з'яўляецца працягам папярэдняй напрацоўкі, апублікаванай ў 2018 г. [1], у якой можна знайсці звесткі пра самога Мацея Стрыйкоўскага і магчымыя крыніцы яго "Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсёй Русі" (далей – "Хроніка…"). Для напісання нашага артыкула выкарыстоўвалася яе трэцяе выданне (1846 г.), у другім томе якога і змяшчалася найбольш цікавая інфармацыя пра знешнепалітычныя стасункі Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) ў сярэдзіне XV – пачатку XVI ст. [2].

Разглядаемы перыяд, звязаны з кіраваннем у ВКЛ Казіміра Ягайлавіча [1440 – 1492], Аляксандра [1492 – 1506] і Жыгімонта [1506 – 1548, фактычна толькі да 1544] Казіміравічаў, а таксама сына апошняга Жыгімонта ІІ Аўгуста [фармальна з 1529, фактычна 1544 – 1572], меў свае асаблівасці ў знешнепалітычнай гісторыі ВКЛ. Менавіта ў гэты час намаганнямі караля польскага і вялікага князя літоўскага Казіміра былі закладзены асновы дынастычнай Ягелонскай кааліцыі дзяржаў у складзе ВКЛ, Польшчы, Чэхіі і Венгрыі, якая праіснавала да 1526 г. [3, с. 250 – 254]. Наяўнасць натуральных саюзнікаў у Цэнтральнай Еўропе, здавалася б, павінна была палепшыць знешнепалітычнае становішча ВКЛ і ўмацаваць яго гегеманісцкія пазіцыі ва Усходняй Еўропе. Аднак рэаліі не спраўдзілі такія спадзяванні. З канца XV ст. ВКЛ было ўцягнута ў значны міжнародны канфлікт з Вялікім Княствам Маскоўскім, які выліўся ў цэлы шэраг войн і прынёс значныя тэрытарыяльныя страты на карысць усходняга суседа. Ілюстрацыю знешнепалітычных падзей гісторыі ВКЛ сярэдзіны XV – пачатку XVI ст. М. Стрыйкоўскі змясціў у 19 – 21 кнігах сваёй "Хронікі …" [2, с. 241 – 314].

Пачатак кнігі 19 адчыняўся вершаваным апісаннем трагічнай бітвы ля Хойніц 1454 г. Нягледзячы на афіцыйны нейтралітэт ВКЛ у Трынаццацігадовай вайне паміж Польшчай і Тэўтонскім ордэнам 1454 – 1466 гг., храніст паведамляў пра ўдзел у бітве прадстаўнікоў ВКЛ [2, с. 242, 243]. Пры гэтым менавіта пяць літвінскіх шляхцічаў далі

магчымасць Казіміру пазбегнуць палону, а шосты, Вол, літаральна выратаваў яму жыццё [2, с. 243, 244].

Пад 1455 г. храніст паведаміў пра план віленскага ваяводы Яна Гаштольда, скарыстаўшыся ўцягнутасцю палякаў у вайну з крыжакамі, вярнуць ВКЛ Падолле і некаторыя валынскія замкі. Аднак дыпламатычныя здольнасці Казіміра дазволілі залагодзіць літвінска-польскі канфлікт і дабіцца дапамогі ВКЛ у барацьбе з Тэўтонскім ордэнам. М. Стрыйкоўскі паведаміў, са спасылкай на літоўскі летапісец, што на дапамогу палякам быў пасланы Іван Хадкевіч, віцебскі намеснік, на чале 8000 коннікаў з ВКЛ пры ўдзеле татар, а таксама са скарбу ВКЛ было пазычана на наём войска 80000 чырвоных злотых [2, с. 248, 256].

Вясной 1455 г. храніст датаваў пасольства да Казіміра ў Вільню ад саюзнага перакопскага хана Хаджы-Гірэя, які абяцаў дапамогу супраць крыжакоў [2, с. 248].

У 1456 г. храніст паведаміў пра абвастрэнне польска-літвінскага канфлікта з-за Падолля (інспіраванага крыжакамі) і спробу дэтранізацыі Казіміра ў ВКЛ на карысць кіеўскага князя Сямёна Алелькавіча, кандыдатуру якога прапанавалі віленскі ваявода Ян Гаштольд, цесць князя Сямёна, а таксама князь Юры Астрожскі і полацкі намеснік, падскарбі земскі Аляксандр Судзімонтавіч [2, с. 250]. Аднак намаганнямі Казіміра, якога падтрымаў троцкі ваявода Манівід і яго прыхільнікі, напружанасць удолося зняць [2, с. 251]. Трэба адзначыць, што на працягу наступнага дзесяцігоддзя “Хроніка…” амаль штогадова паведамляла пра польска-літвінсія супярэчнасці з-за Падолля.

Між тым у 1457 г. (згодна М. Стрыйскоўскага – у 1456 г.) памёр чэшскі і венгерскі кароль Уладзіслаў, якога на троне Чэхіі замяніў Іржы з Падэбрад, а ў Венгрыі – Мацьяш Хуньядзі [2, с. 251]. У 1458 г. ад новага чэшскага караля да Казіміра прыбыло пасольства, па выніках якога было заключана саюзнае пагадненне: узамен за прызнанне Іржы чэшскім каралём, Казіміру была абяцана дапамога ў барацьбе супраць крыжакоў і перадача Чэхіі ў спадчыну Казіміру і яго сынам пасля смерці Іржы [2, с. 246, 254].

У 1460 г. было падпісана пагадненне з Чэхіяй пра пасаг жонкі Казіміра Альжбеты Габсбург, якая была чэшскай і венгерскай прынцэсай [2, с. 246].

У 1461 г. на сойме ў Вільні прадстаўнікі ВКЛ зноў паставілі пытанне аб пастаянным знаходжанні манарха ў ВКЛ ці абранні вялікім князем літоўскім князя Сямёна Алелькавіча, вырашэнне якога Казіміру ўдалося адкласці да заканчэння вайны з крыжакамі [2, с. 259-260]. Пад тым жа годам храніст зноў паведамляў пра дапамогу з ВКЛ, высланую Казіміру, якая дазволіла здабыць лакальную перамогу ў Прусіі [2, с. 261].

У 1462 г. адбыўся і з’езд Казіміра з Іржы з Падэбрад у Глогаве, на якім было пацверджана пагадненне аб саюзе з Чэхіяй супраць туркаў [2, с. 247, 261].

У 1462 г. таксама адбыліся пераломныя ў ходзе Трынаццацігадовай вайны бітвы пад Няшавай і Пуцкам, дзе перамогу палякам дапамаглі здабыць літоўскія татары [2, с. 262-265].

Пад 1465 г. “Хроніка…” паведаміла пра малавядому прыезд у ВКЛ антыяхійскага патрыярха. Той выступаў паслом ад папы рымскага і імператара да перакопскага хана Хаджы-Гірэя, з прапановай далучыцца да антытурэцкай кааліцыі. Хітры крымскі хан, узяўшы вялікія падарункі, адказаў, што не можа згадзіцца на гэту прапанову без згоды свайго саюзніка Казіміра. Гэта і прывяло да прыезда пасла ў ВКЛ. Казімір жа, які меў напружаныя адносіны з Ватыканам і быў уцягнены ў вайну з крыжакамі, адправіў пасла, не даўшы яму пэўнага адказу [2, с. 267].

У 1466 г. была сарвана спроба інфлянцкіх рыцараў прыйсці на дапамогу Тэўтонскаму ордэну, прайшоўшы праз тэрыторыю Жамойці. Там лівонцы былі разбіты [2, с. 267-268]. Неўзабаве пасля гэтага 19 кастрычніка 1466 г. быў падпісаны Торунскі мір, які паклаў канец вайне [2, с. 270].

У 1468 г. з дазволу Іржы з Падэбрад сын Казіміра Уладзіслаў быў прызначаны спадчыннікам Чэхіі пры ўмове яго шлюбу з дачкой Іржы Людмілай [2, с. 247].

У 1469 г. малдаўскі ваявода Стэфан праз паслоў прынёс васальную прысягу Казіміру [2, с. 271].

Каля 1469 – 1470 гг. адбыўся вялікі наезд татар вялікай Арды на “рускія” землі ВКЛ і Польшчы, а таксама на Малдавію. Храніст паведаміў пра вялікія шкоды,

нанесеныя на Валыні і Падоллі і 10-тысячны палон беспакарана выведзены татарамі, нягледзячы на тое, што Казіміра пра наезд папярэджваў крымскі хан Менглі-Гірэй [2, с. 271].

Пад 1471 г. храніст паведаміў пра памежны канфлікт ВКЛ з Лівоніяй, які быў вырашаны дыпламатычнымі сродкамі шляхам пацвярджэння літвінска-лівонскага мірнага пагаднення [2, с. 272].

Кніга 20 пачыналася з паведамлення аб тым, што ў 1471 г. пасля смерці Іржы з Падэбрад пасля дыпламатычнага дэмарша Казіміра яго старэйшы сын Уладзіслаў быў абраны каралём Чэхіі. Пасля гэтага пачалася барацьба апошняга з Мацьяшам Хуньядзі, вергерскім каралём, якога падтрымала другая частка чэшскіх арыстакратаў [2, с. 247, 273]. Скарыстаўшыся сітуацыяй, апазіцыйныя да Мацьяша венгерскія паны запрасілі на венгерскі трон другога сына Казіміра, таксама Казіміра [2, с. 274], але ў ваенным супрацьстаянні перамог Мацьяш [2, с. 275]. Уладзіславу ж утрымацца на троне Чэхіі ў 1473 – 1474 гг. дапамагла толькі дапамога бацькі, у т.л. грошы, пазычаныя са скарбу ВКЛ, і некалькі тысяч войска ВКЛ пры ўдзеле літоўскіх татар [2, с. 277].

У 1475 г. храніст паведаміў пра шлюб старэйшай дачкі Казіміра Ядзвігі з герцагам Баварыі Георгам, у пасаг якой былі абяцаны 32000 залатых гульдэнаў [2, с. 281].

Пад 1477 – 1478 гг. храніст паведаміў пра захоп вялікім князем маскоўскім Іванам ІІІ Васільевічам Вялікага Ноўгарада, які М. Стыйкоўскі лічыў вотчынай ВКЛ. Храніст вінаваціў у гэтым нядбаласць літвінаў і асабіста Казіміра [2, с. 282]. Атрымаўшы звесткі пра гэта, Казімір спешна выехаў у ВКЛ, адкуль адправіў свайго двараніна Стрэта да хана Вялікай Арды Ахмата з просьбай дапамагчы супраць Масквы [2, с. 283]. На заклік Казіміра хан Ахмат рушыў да маскоўскай мяжы і стаў на р. Угры. Аднак Казімір вырашыў заключыць з вялікім князем маскоўскім Іванам ІІІ пагадненне, бо не меў моцы весці з ім вайну. Не атрымаўшы вестак ад Казіміра, узяўшы прысланыя Іванам ІІІ падарункі і затрыманыя да гэтага ўпамінкі за некалькі гадоў, хан Ахмат адыйшоў у Арду, дзе быў забіты [2, с. 282].

У 1485 г. адбылася чарговая васальная прысяга малдаўскага ваяводы Стэфана Казіміру [2, с. 287-288]. У гэтым жа годзе пасля захопу вялікім князем маскоўскім Іванам ІІІ Вялікага Княства Цвярскога ў ВКЛ эміграваў вялікі князь цвярскі Міхаіл Барысавіч [2, с. 288].

У 1489 і 1490 гг. адбыліся наезд татар на паўднёвыя землі Польшчы і ВКЛ, якія былі адбіты з войскамі Польшчы і ВКЛ на чале з каралевічам Янам Ольбрахтам [2, с. 288].

У выніку барацьбы паміж каралевічамі Янам Ольбрахтам і Уладзіславам Казіміравічамі за трон Венгрыі, вольны пасля смерці Мацьяша Хуньядзі ў 1490 г., у 1492 г. перамог Уладзіслаў [2, с. 289-290]. Казімір быў незадаволены такім вынікам, бо лічыў неабходным узвесці на венгерскі трон Яна Ольбрахта. Каб пакараць старэйшага сына ён рушыў у Польшчу, адклаўшы вырашэнне спраў з вялікім князем маскоўскім Іванам ІІІ, на бок якога разам з землямі перайшла частка Северскіх князёў. Таксама неабходна было завяршыць справу шлюбу дачкі Ганны з паморскім герцагам Багуславам Шчэцінскім (1491 г.). Але па дарозе кароль польскі і вялікі князь літоўскі Казімір захварэў у Гродне, дзе і памёр 7 чэрвеня 1492 г. [2, с. 291].

Кніга 21 пачыналася паведамленнем пра абранне на трон у ВКЛ каралевіча Аляксандра, а ў Польшчы – Яна Ольбрахта [2, с. 293-295]. Пачатак маскоўска-літвінскай вайны 1492 – 1494 гг. М. Стрыйкоўскі аднёс да 1493 г., калі, па яго звестках, вялікі князь маскоўскі Іван ІІІ пачаў вайну супраць ВКЛ, захапіўшы Вязьму, Хлепень, Мязецк, Любуцк, Мцэнск, Сярпейск і інш. замкі. Вялікае пасольства ў складзе троцкага ваяводы і маршалка земскага Пятра Янавіча, жамойцкага старосты Станіслава Янавіча Кезгайлы, маршалка Войцеха Янавіча Клачко і пісара Фёдара Рыгоравіча, пасланае Аляксандрам, заключыла вечны мір, па ўмовах якога ўсе страты ВКЛ, у т.л. Ноўгарад і Вязьма, засталіся за Масквой. Мір быў падмацаваны шлюбам вялікага князя літоўскага Аляксандра з дачкой вялікага князя маскоўскага Івана ІІІ Аленай. У тым жа 1494 г. адбыўся з'езд у Левочы, дзе сустрэліся браты Ягелоны чэшскі і венгерскі кароль Уладзіслаў, польскі кароль Ян Ольбрахт, каралевіч Жыгімонт і кардынал Фрыдэрык, а

таксама іх пляменнік Фрыдрых, маркграф брандэнбургскі, дзе абмяркоўваліся пытанні стварэння антытурэцкай кааліцыі [2, с. 295-296]. Восенню 1494 г. польска-літвінскае войска пацярпела паражэнне ад татар пад Вішняўцом [2, с. 297].

У 1495 г. вялікае пасольства ў складзе віленскага кашталяна і гродзенскага намесніка князя Аляксандра Юр'евіча Гальшанскага, троцкага кашталяна і полацкага намесніка Яна Юр'евіча Заберазінскага, браслаўскага намесніка Юрыя Зяновіча, пісара Фёдара Рыгоравіча прывезла ў Вільню нявесту Аляксандра, дзе хутка адбылося вяселле. На ім прысутнічалі і паслы вялікага князя маскоўскага Івана III князь Сямён Рапалоўскі, Міхаіл Русалка, Іван Скуратаў і пісар Іван Кулешын [2, с. 297].

У 1496 г. адбылася асабістая сустрэча вялікага князя літоўскага Аляксандра з польскім каралём Янам Ольбрахтам у Парчове, дзе дамовіліся аб сумесным удзеле ў антытурэцкай лізе [2, с. 298]. Аднак Чарнаморская выправа Ягелонаў вылілася ў няўдалы паход польскага караля Яна Ольбрахта супраць малдаўскага ваяводы Стэфана. Вялікі князь літоўскі Аляксандр не паспеў далучыцца да выправы з-за супраціўлення Рады паноў ВКЛ і адправіў на дапамогу брату толькі атрад добраахвотнікаў на чале з лідскім намеснікам Станіславам Пятровічам Кішкам і князем Сямёнам Шамяцічам [2, с. 299-302]. Прыйсці на дапамогу своечасова літвінскія войскі не паспелі, бо па дарозе сутыкнуліся з малдаўскім атрадам, які разбілі [2, с. 303]. На зваротным шляху яны за 12 міль ад Брацлава разбілі татарскі атрад [2, с. 304].

У 1499 г. салідарнасць Венгрыі, Чэхіі, Польшчы і ВКЛ была падмацавана ваенна-палітычнымі саюзамі. Тады ж была ўзноўлена польска-літвінская ўнія, а таксама падпісаны польска-малдаўскае і літвінска-малдаўскае мірныя і саюзныя пагадненні [2, с. 306-307]. Між тым вялікі князь маскоўскі Іван III, заключыўшы саюз з крымскім ханам Менглі-Гірэем і малдаўскім ваяводам Стэфанам, падрыхтаваўся да новай вайны з ВКЛ, падставай да якой назваў ганенні на праваслаўных [2, с. 308]. Вайна пачалася ў 1500 г. пераходамі князёў Васіля Мажайскага і Сямёна Шамяціча на маскоўскую службу разам з землямі [2, с. 309]. Бітва на р. Вядрошы скончылася паражэннем войска ВКЛ і палонам ваеннага кіраўніцтва на чале з гетманам князем Канстанцінам Астрожскім [2, с. 309-310]. Сітуацыю пагоршылі напады крымскіх татар на землі ВКЛ і Польшчы [2, с. 310].

У 1501 г. быў заключаны саюз з Вялікай Ардой супраць Крымскага ханства і Маскоўскай дзяржавы і памёр польскі кароль Ян Ольбрахт [2, с. 312-313].

Такім чынам, "Хроніка …" М. Стрыйкоўскага багатая звесткамі пра падзеі знешняй палітыкі ВКЛ сярэдзіны XV – пачатку XVI ст. Надзвычай насычаная імі кніга 21 "Хронікі …", якая ахоплівае перыяд 1492 – 1501 гг., калі была разарвана персанальная ўнія з Польшчай. У цэлым, "Хроніка …" з'яўляецца цікавай самастойнай крыніцай па гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ сярэдзіны XV – пачатку XVI ст.


1. Мікалаева, Л.В. "Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсёй Русі" Мацея Стрыйкоўскага як крыніца па гісторыі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIV – сярэдзіне XV ст./ Л.В. Мікалаева// Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе: сборник научных статей по материалам третьей международной научной конференции, Пинск 30 ноября – 1 декабря 2018 г./ Полес. гос. ун-т; под ред. Р.Б. Гагуа. – Пинск: ПолесГУ, 2018. – Вып. 3. – С. 32 – 36.
2. Stryjkowski, M. Kronika Polska, Litewska, Zmodzka i Wszystkiej Rusi Macieja Stryjkowskiego. Wydanie nowe, będące dokładnem powtorzeniem wydania pierwotnego krolewieckiego z roku 1582, poprzedzone Wiadomością o życiu i pismach Stryjkowskiego przez Mikołaja Malinowskiego, oraz Rozprawą o latopiscach Ruskich przez Daniłowicza, pomnożone przedrukiem dzieł pomniejszych Stryjkowskiego według pierwotnych wydań/ M. Stryjkowski. – Warszawa: Nakład Gustawa Leona Glucksberga, Księgarza, 1846. – T. II. – 572 s.
3. Мікалаева, Л.В. Дынастычная палітыка Ягелонаў і знешняя палітыка Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XV – сярэдзіне XVI ст./ Л.В. Мікалаева// Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки. Сборник научных статей/ под ред. В.Ф Беркова. – Минск: РИВШ, 2013. – Выпуск 13: В 2 ч. – Ч. 1. – С. 249 – 255.

# “CHRONICLE OF POLAND, LITHUANIA, SAMOGITIA AND ALL RUS” OF MATVEY STRYJKOWSKI AS THE SOURCE TO HISTORY OF FOREIGN POLICY OF GRAND DUCHY OF LITHUANIA AT THE MID OF THE XV – BEGINNING XVI CENTURY.

***Liudmila V. Mikalayeva***
*PhD, Belarusian State University of Informatics and Radioelectronics, Minsk, Belarus*
Mikalayeva@bsuir.by

**Summary:** In article the contents of the “Chronicle of Poland, Lithuania, Samogitia and all Rus” by Matvey Stryjkowski are analyzed. Is drawn the conclusion about a possibility of its use as an interesting independent source to history of foreign policy of Grand Duchy of Lithuania at the mid of the XV – beginning XVI century

***Keywords: sources, foreign policy, the Grand Duchy of Lithuania, Matvey Stryjkowsk***